УДК 801.3

# ПСІХАЛОГІЯ ПУБЛІЧНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ

*К.С. Марчанка, Ф.І. Сіўко*
*УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»*

Прамоўніцкае мастацтва – сукупнасць аперацый па падрыхтоўцы і вымаўленню публічнай прамовы, правядзенню гутаркі, дыскусіі з мэтай дамагчыся жаданай рэакцыі аўдыторыі.

Не толькі ўменне падрыхтаваць гаворку, але і ўменне свабодна трымацца перад публікай, бездакорна валодаць голасам, жэстам і мімікай і беспамылкова рэагаваць на паводзіны аўдыторыі – такія аб'ектыўныя патрабаванні да тых, хто імкнецца зрабіць жаданае ўздзеянне на слухачоў, пераканаць іх у правільнасці тых ці іншых палажэнняў. Задача выступоуцы – як мага больш дакладна данесці свае ідэі да аўдыторыі. Калі гэтага не адбудзецца, працоўны час страчаны дарэмна. Каб выступ быў якасным, працэс падрыхтоўкі да яго павінен доўжыцца прыкладна ў два разы больш, чым сам выступ.

Выступы адрозніваюцца па тэматыцы, аб'ёме, мэце і гэтак далей. Аднак існуюць устойлівыя прыёмы маўленчай распрацоўкі тэксту выступу. Да выступлення абавязкова трэба падрыхтавацца. Не варта разлічваць на імправізацыю, калі існуе хоць бы найменшая магчымасць для падрыхтоўкі. Калі ёсць магчымасць, неабходна падумаць над будучай прамовай некалькі дзён. За гэты час з'явіцца мноства новых ідэй. Неабходна сфармуляваць канкрэтную мэту выступу адной прапановай і як мага ясней. Сфармуляваць асноўную думку выступлення неабходна адразу ж у пачатку выступлення. Не варта зацягваць ўвядзенне тэзіса. Калі зацягваецца выкладанне сутнасці справы, то раздражненне аўдыторыі расце ў геаметрычнай прагрэсіі. Трэба пачынаць выкладанне зместу з самых галоўных, асноўных тэзісаў. На канец пакінуць другасныя кампаненты. Асаблівы этап падрыхтоўкі складае праца з тэкстам выступу. Не трэба спрабаваць "уціснуць» занадта шмат матэрыялу ў абмежаваны час. Ацэнка тэмы, мэты выступлення і аўдыторыі з'яўляецца асновай і фонам стварэння паведамлення на дадзеную тэму для дадзенай аўдыторыі і ў адпаведнасці з канкрэтным становішчам. Гэты этап уключае падбор матэрыялаў, кампазіцыйна-лагічнае афармленне маўлення, выкарыстанне факталагічнага матэрыялу, работу над мовай і стылем выступу. Пры падрыхтоўцы тэксту выступу асобны, самастойны напрамак працы складае праца з цытатамі. Прызначэнне іх можа быць розным. Адны могуць быць разлічаны на эмоцыі, іншыя апелююць да свядомасці, пераконваюць прыведзеным фактычным матэрыялам, трэція абапіраюцца на аўтарытэт крыніцы. Прыводзячы аргументы ў абгрунтаванне свайго меркавання, варта размясціць іх такім чынам, каб іх сіла ўзрастала. Самыя моцныя аргументы пастаўце ў канцы. Канчатковы аргумент фіксуецца ў памяці лепш, чым першы. Пры неабходнасці падбярыце да кожнага тэзіса адпаведную інфармацыю: статыстычныя дадзеныя, звесткі па гісторыі пытання, вынікі сацыялагічных апытанняў. Вырашыце, якія раздзелы ўключыць у выступ і якое прызначэнне кожнага раздзела. Размясціце раздзелы ў лагічным парадку, улічваючы час. Зрабіце іх дастаткова кароткімі, каб павялічыць перыяд устойлівай ўвагі аўдыторыі. Адзначце раздзелы па ступені важнасці, каб у выпадку неабходнасці хутчэй адсеяць непатрэбную інфармацыю. Прапрацуйце ўвесь праект выступу ў пошуках момантаў, дзе цікавасць аўдыторыі можа паніжацца. Выявіце тлумачэнні або аргументы, якія занадта доўгія або

Витебский государственный технологический университет

складаныя, і спрасціце іх. Загадзя трэба падумаць аб лічбах. У тэксце не павінна быць шмат лічбавага матэрыялу, бо гэта стамляе аўдыторыю, засланяе галоўнае.

Візуальныя сродкі выкарыстоўваюцца для дапаўнення таго, што паведамляе аратар. Асноўныя візуальныя сродкі – гэта слайды, відэазапісы, дыяграмы. Не выкарыстоўвайце візуальныя сродкі без важкіх прычын і не перагружайце выступ тэхнічнымі прыёмамі. Вызначыцеся адносна аўдыторыі. Вы ладзіце выступ з пэўнай мэтай, але ваша аўдыторыя таксама мае свае мэты, інтарэсы, меркаванні і г.д. Каб эфектыўна данесці матэрыял, неабходна зразумець слухачоў. Таму вызначце мэты, чаканні і каштоўнасці меркаванай аўдыторыі. Рэакцыя кожнага тыпу аўдыторыі розная, таму выкладанне матэрыялу таксама павінна адрозніваецца. Падчас выступу варта пастаянна кантраляваць рэакцыю слухачоў.

Перад выступам неабходна правесці рэпетыцыю выступу. Падчас выступу захоўвайце ўпэўнены выгляд, ён дзейнічае на слухача. Каб пераадолець хваляванне, шляхам пробаў і памылак знайдзіце свой оптымум – ваш унутраны стан, пры якім вы дасягаеце поспеху. Такі стан ва ўсіх людзей вельмі індывідуальны: хтосьці адчувае «радасць палёту», хтосьці – засяроджанасць, канцэнтрацыю і волю, а хтосьці павінен крыху хвалявацца.

Да падрыхтоўкі тэксту выступу варта падысці сур'ёзна і адказна, добра прапрацаваць увесь выступ. А пры выступленні справіцца з хваляваннем і ўсталяваць з аудыторыяй добры кантакт.

Спіс выкарастаных крыніц

1. Веденская, Л. А. Культура и искусство речи / Л. А. Веденская, Л. Г. Павлова. – Ростов-на-Дону : "Феникс", 1995. – 576 с.
2. Зубра, А. С. Ораторское исскуство / А. С. Зубра. – Минск : Дикта, 2007. – 288 с.
3. Карнеги, Дейл. Как вырабатывать уверенность в себе и влиять на людей, выступая публично : пер. с англ. / общ. ред. и предисл. В.П. Зинченко, Ю. М. Жукова – Ленинград : Лениздат, – 1991. – 708 с.
4. *Заўвага:* палажэнні артыкула ілюстраваліся падчас чытання творамі беларускай літаратуры ў выкананні студ. гр. 1Мн-20 Уласкіна Аляксандра, гр. 1Мн-21 Гедрэвіч Ганны, Кудраўцавай Дар'і, Валадкевіча Ігара, гр. 1Фк-11 Ліпскага Дзмітрыя.

УДК 940.53/54

## МАССОВЫЕ ИСТРЕБЛЕНИЯ СОВЕТСКИХ ГРАЖДАН В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

***А.В. Турко, Л.Ф. Пашкевич***

*УО «Витебский государственный технологический университет»*

Осуществление гитлеровцами политики геноцида в отношении советских людей началось с первых дней войны. Расстрелы и массовые экзекуции приобрели огромные размеры. Солдаты и офицеры вермахта, каратели гитлеровских оперативных групп, растоптав все международные соглашения и конвенции о законах ведения войн, повсеместно совершали чудовищные расправы над гражданским населением и военнопленными.

Практическому осуществлению преступных замыслов германского фашизма способствовала изощренная идеологическая обработка солдат вермахта и войск

Витебский государственный технологический университет